# Ностальгия по хорошим людям

**Самые интересные книги недели: Маргарита Прохар**




**Маргарыта Прохар. Восень у Вільнюсе. Аповесці і апавяданні. Мінск, Мастацкая літаратура, 2014**

Перш за ўсё адзначым, что гэта выдатны ўзор мастацтва кнігі. Вядомы мастак Уладзімір Васюк аформіў зборнік з адсылкай да супрэматызму. Незвычайныя, густоўныя графічныя рашэнні, што нагадваюць пра Малевіча і Кандзінскага, ілюстрацыі, якія і пашыраюць успрыманне тэксту, і з’яўляюцца самадастатковымі творамі, — дзеля аднаго гэтага варта ўзяць у рукі кнігу. А ёсць яшчэ і захапляльны змест. Маргарыта Прохар умее ствараць яркую, запамінальную атмасферу для разгортвання сюжэта: восеньскі Вільнюс з утульнымі кавярнямі, брукаванымі вулкамі і жоўтымі лістамі, што прыліпаюць да абутку... Бераг Балтыйскага мора, дзюны з белага пяску... Прага — «стары, стомлены горад», Карлаў мост, на якім ліхтары асвятляюць фігуркі святых і групкі турыстаў... Бадай што, агульнае ў пейзажах — пачуццё настальгіі і трывогі, восеньскі настрой і прадчуванне вялікага пачуцця. Каханне і з’яўляецца магістральным сюжэтам. Але гэта не запаволеная лірычная проза, наадварот, вельмі дынамічная, з выкарыстаннем элементаў дэтэктыву, асабліва ў аповесці, паводле якой названы зборнік. Дзяўчыну, што займаецца росшукам зніклых хатніх жывёлаў, наймае багаты кліент, каб тая адшукала ў Вільнюсе ягоную каханую. Але чым далей працягваюцца пошукі, тым выразней гераіня разумее, што справа не ў росшуках, а ў спробе героя адпусціць мінулае. Персанажы прозы Маргарыты Прохар — нашы сучаснікі, людзі адукаваныя, творчыя, здольныя на дзівацтвы. А галоўнае — на складаныя пачуцці, пра якія толькі і варта пісаць.

Людмила Рублевская
Беларусь сегодня. – 2014. – 12 дек.